8. *Казлоў, А.* Гульня ў хованкі / А. Казлоў // Апавяданне-2005. – Мінск, 2005. – С. 134–140.
9. *Канановіч, І.* Вепраўцы / І. Канановіч // Полымя. – 2011. – № 12. – С. 66–77.
10. *Каско, А.* Апошні ваўкалак / А. Каско // Апавяданне-2005. – Мінск, 2005. – С. 152–157.
11. *Ліпскі, У.* Мужык / У. Ліпскі // Полымя. – 2011. – № 2. – С. 50–73.
12. *Максімовіч, В.* Застацца людзьмі / В. Максімовіч // Полымя. – 2011. – № 12. – С. 97–102.
13. *Максімовіч, В.* Традыцыя ў жыцці асобы і грамадства / В. Максімовіч // Полымя. – 2011. – № 4. – С. 142–147.
14. *Мароз, У.* Крыж на хутары / У. Мароз // Апавяданне-2005. – Мінск, 2005. – С. 178–187.
15. *Москвин,* В. П. Русская метафора: очерк семиотической теории / В. П. Москвин. – Изд. 4-е, испр. и доп. – М. : Изд-во ЛКИ, 2012. – 200 с.
16. *Старычонак, В. Д.* Мнагазначнасць слова ў беларускай мове : у 3 кн. / В. Д. Старычонак. – Мінск : Колоград, 2017. – Кн. 1: Асноўныя тыпы полісеміі, кірункі семантычнай дэрывацыі. – 273 с.

*І. А. Воран (Беларусь)*

# ТВОРЧАСЦЬ ЯКУБА КОЛАСА Ў КАНТЭКСЦЕ САЦРЭАЛІСТЫЧНАГА КАНОНА

Савецкая літаратура 30–40-х гадоў развіваецца ў полі канстытуявання сацрэалізму як магістральнага напрамку ў культуры і фарміравання сацрэалістычнага канона. У гэты перыяд яна перажывала фазу станаўлення нарматыўных межаў і патрабаванняў новага метаду. Ужо ў 20-я гады ішлі напружаныя дыскусіі пра змест і форму пралетарскай літаратуры паміж тэарэтыкамі літаратурных аб'яднанняў Пралеткульт, РАПП, ЛЕФ і інш. У працэсе абмеркавання высоўваліся тэорыі «жывога чалавека», «вытворчага» мастацтва, а таксама стратэгія «сацыяльнага заказу», якія разглядаліся праз прызму палітыкі і эстэтызацыі ідэалогіі. Вострыя спрэчкі пра мову мастацкіх твораў і фармалізм вяліся ў 30-я гады, а ў 50-я гады – пра «тэорыю бесканфліктнасці» і праблему «станоўчага героя», якія хутка перараслі ў кампаніі і спрыялі замацаванню пэўных норм новага метаду.

Правакатыўная, рэвізіяніцкая і нават у нейкім сэнсе агрэсіўная стратэгія канструявання сацрэалістычнага канона абумовіла спецыфічную атмасферу ў літаратурным асяроддзі. Хваля рэпрэсій 30-х гадоў абумовіла пачатак працэсу «дэаўтанамізацыі» беларускай літаратуры, паступовага і планамернага ўключэння яе ў «поле ўлады» (паводле П. Бурдзьё [1]), замацавання залежнасці яе зместу і формы ад палітычнай, ідэалагічнай ангажаванасці. «Сацыялістычны рэалізм прадугледжвае непарыўнасць сувязі мастацтва з рэвалюцыйным развіццём жыцця, з задачамі камуністычнага будаўніцтва – і гэтыя яго рысы з асаблівай нагляднасцю раскрываюцца ў літаратурным працэсе 30-х гадоў» [6, с. 30].

Літаратурна-публіцыстычныя артыкулы і публіцыстычныя вершы Я. Коласа адлюстравалі «жыццябудаўнічы» пафас гэтага часу, неабходнасць выконваць сацыяльны заказ як кампрамісную меру ў кантэксце ідэалагічнага ціску на беларускіх літаратараў. Шэраг літаратуразнаўцаў (М. Мушынскі, М. Тычына і інш.) адзначалі негатыўны ўплыў на творчасць Я. Коласа напружанай грамадска-палітычнай абстаноўкі 30-х гадоў, выяўляючы такія яго наступствы, як аднабаковасць, перадузятасць, павярхоўнасць, спрошчанасць пісьменнікавай інтэрпрэтацыі рэчаіснасці, дыдактычнасць і тэндэнцыйнасць у выражэнні ідэі, што прыводзіла да дэфармацыі жыццёвага матэрыялу і зніжэння мастацка-эстэтычнай вартасці твораў.

І. А. Есаулаў, у сваю чаргу, адзначыў, што «асаблівасць сацрэалістычнага дыскурса ў тым і заключаецца, што чытач павінен не толькі апазнаць тэкст як «рэалістычны», але і адчуць спецыфічную мастацкую «дэфармацыю» гэтага жыццёвага матэрыялу» [3, с. 596], якая выконвае функцыю антыцыпацыі, г. зн. апярэджвання будучыні, яе прадбачанне. Пісьменнік павінен быў ствараць мадэль чаканай будучыні і выклікаць у чытача «катарсіс жыццябудаўніцтва». Асабліва прыкметна гэтая тэндэнцыя праявілася ў апавяданнях і лірыцы Я. Коласа 30-х гадоў, але навідавоку зніжэнне творчай актыўнасці пісьменніка ў параўнанні з папярэднім дзесяцігоддзем.

У апавяданнях «Арыніна перамога» (1931) і «Кінахроніка» (1935) імкненне сцвердзіць ідэю барацьбы савецкай улады з прыгнечанасцю, непісьменнасцю, неўладкаванасцю народа перавышае ўласна мастацкую задачу праўдзівага адлюстравання рэчаіснасці. У выніку падобнай ідэйнай зададзенасці Я. Коласам ствараецца схематычны вобраз сіраты Арыны, безабароннай ахвяры, якая церпіць пакуты і ад кулака Гармізы, і ад родзічаў, якія пакінулі яе без хаты і апекі. «Арынка ж да ўсходу сонца падымалася з пасцелі, са свайго бярложку за печчу ў кухні, апошняю клалася спаць. Хадзіла летам босая, зімой у лапцях, у старых неданосках, з патрэсканаю скураю на руках, з заскарузлымі ад работы пальцамі. У няспыннай рабоце, не ведаючы адпачынку, у слепаце і цемнаце праходзіла яе дзявоцтва» [4, с. 311–312]. Відавочнае мінорнае згушчэнне фарбаў у абмалёўцы сірочай долі гераіні рэзка мяняецца на аптымістычна-ўзнёслае, мажорнае з прыходам савецкай улады, якая «заступаецца за беднату, за абяздоленую голь, за батрацтва» [4, с. 312]. Далейшы лёс Арыны складваецца прадказальна станоўча, дэманстратыўна падмацоўвае ідэалагічную ўстаноўку. Падобная сюжэтная мадэль, пабудаваная на кантрасце дарэвалюцыйнай забітасці і савецкага росквіту грамадства, досыць рэпрэзентатыўная для сацрэалізму.

Падобная ідэйная схема назіраецца і ў апавяданні «Кінахроніка», дзе «пакрыўджаная» прыродай ад нараджэння Ева становіцца ўдарніцай калгасу, знаходзіць сваё грамадскае прызначэнне і асабістае шчасце, рэпрэзентуючы папулярны ў савецкія часы лозунг – «кадры вырашаюць усё!» [4, с. 318]. Аўтар не тлумачыць, чаму менавіта Еве даручылі «вялікую справу дзяржаўную» і ўсе прагаласавалі «аднагалосна» за яе кандыдатуру, якія асабістыя якасці гераіні дазволілі старшыні калгаса Амяльяну Пятровічу прызначыць яе на адказную пасаду. Дэкларацыйна-публіцыстычнае гучанне лозунга падсвечваецца «гісторыяй» кахання маладога заатэхніка і гераіні. Пры гэтым Я. Колас пакідае па-за ўвагай духоўнае станаўленне Евы, сталенне новага светапогляду і кахання герояў, развіццё думак і пачуццяў гераіні.

М. Мушынскі слушна адзначыў, што ў апавяданнях 30-х гадоў «працэс нараджэння асобы падменены аўтарскімі апісаннямі, інфармацыяй, якая глыбока не кранае чытача, не ўражвае пераканальнасцю малюнка, сакавітасцю фарбаў, жыццёва праўдзівымі рэчыўнымі і псіхалагічнымі дэталямі» [5, с. 296]. Адсутнасцю пераконлівай дэталізацыі ўнутранага жыцця герояў, пластычнасці пачуццяў і думак абумоўлены схематызм персанажаў-»рупараў» апавяданняў. У выніку працэсу дэаўтанамізацыі, абумоўленага палітызацыяй грамадства і сферы культуры, у сацрэалізме адбывалася перастаноўка аксіялагічных акцэнтаў у дыхатаміі «асоба – калектыў», калі «ідэя асобы» страціла сваю актуальнасць і на першы план выступіла калектыўная свядомасць.

Характэрна, што дэфармацыя рэчаіснасці адбываецца двума шляхамі: у першым выпадку ролю ідэалагічнага дэфарматара рэальнасці выконвае аўтар, а героі – толькі дэкаратыўную функцыю; у другім выпадку актыўную пазіцыю транслявання партыйных каштоўнасцей займаюць героі, а аўтар – пазіцыю «хранікёра» дынамічнай савецкай рэчаіснасці. Першая пазіцыя характэрная для перыяду станаўлення канона, а другі шлях сведчыць пра пачатак працэсу дэкананізацыі сацрэалізму, калі аўтар намагаецца адмежавацца ад патрабаванняў класава-партыйнай эстэтыкі. У апавяданні «Макарка Навак» (1938) Я. Колас выкарыстоўвае другую стратэгію, падмацоўваючы гонар і пафас радаснага «жыццябудаўніцтва» савецкай рэчаіснасці ідэалагічнай падкаванасцю дванаццацігадовага героя. Макарка з ненатуральнай для свайго ўзросту заўзятасцю выкрывае сацыяльна-гістарычныя супярэчнасці часу, выказвае класава-партыйную пазіцыю ў адносінах і да «ўсходніх крэсаў», і да «заклятых ворагаў-прыблудаў» – польскіх кулакоў-асаднікаў, панскіх «трутняў-дармаедаў», і да ксяндзоў, «прабеглых выжыг у чорных сутанах», трымаючы ў сэрцы нянавісць да іх і арыентуючыся на «светлыя вобразы вялікіх прыяцеляў прыгнечанага люду, яго правадыроў і настаўнікаў – Леніна і Сталіна» [4, с. 326]. Вобраз героя-піянера канструюецца ў адпаведнасці з ідэалагічнымі ўстаноўкамі на рытарычнасць, публіцыстычнасць і класавую непрымірымасць, але насуперак жыццёвай праўдзе. Таму надзвычайная палітычная адукаванасць, ідэалагічная сталасць мыслення, незвычайная назіральнасць падлетка выглядаюць непераканальна, успрымаюцца ў большай ступені як узор для пераймання, які павінен служыць справе партыйнага выхавання савецкай моладзі.

Апавяданні Я. Коласа 30-х гадоў дэманструюць відавочна актуальны для сацрэалізму тэматычны дыяпазон: барацьба з ідэалагічным ворагам («Адзін», 1930; «Макарка Навак», 1938), перамога савецкай улады над прыгнечаным станам і непісьменнасцю народа («Арыніна перамога», 1931), развіццё вытворчасці («Кінахроніка», 1935). Навідавоку праблемна-тэматычнае, жанрава-стылёвае і нават колькаснае збядненне апавяданняў Я. Коласа. М. Тычына адзначаў агульную тэндэнцыю ў апавяданнях 30-х гадоў да спрашчэння складанай карціны рэальнага жыцця на карысць адлюстравання сацыяльных канфліктаў, ідэалагічных супярэчнасцей часу: «прыкметна скараціўся рэестр мастацкіх ідэй, знікла зусім «ідэя асобы», якая цікавіла празаікаў у папярэдняе дзесяцігоддзе, бяднейшай стала тэматыка твораў, нягледзячы на тое, што з’явіліся «вытворчы нарыс» і тэма змагання з «ворагамі народа»« [7, с. 106]. Але жанрава-тэматычныя надбанні малой прозы не маглі кампенсаваць дэфіцыт гуманістычнага зместу

твораў, іх мастацка-эстэтычнай дасканаласці, які ў межах сацрэалістычнага канона (у яго радыкальнай фазе кананізацыі) ліквідавацца не меў магчымасці.

Апавяданні 1941 года таксама не сталі прыкметнай з’явай у творчай біяграфіі Я. Коласа («Сустрэча з ворагам», «У разведцы», «Санітарка Таня»). Але змяніліся гістарычныя абставіны: ваенная рэчаіснасць патрабавала ад творцаў водгуку на галоўную праблему часу – барацьбу з фашызмам, а таксама праўдзівага фактычнага матэрыяла, псіхалагічна-эмацыянальнай дасведчанасці пра тую экстрэмальную франтавую і партызанскую абстаноўку, у якой развіваліся падзеі вайны, чаго не хапала Я. Коласу.

У 30–40-я гады ў полі сацрэалістычнага дыскурсу адбываецца выразная іерархізацыя жанраў, вызначэнне прыярытэтных жанравых форм. Так, «сацрэалізмам дастаткова падрабязна задаецца схема пабудовы рамана, у той час як больш кароткія празаічныя жанры або лірыка рэгулююцца слаба. Невыпадкова менавіта раман лічыцца дамінуючым, вызначальным жанрам сацрэалізму» [2, с. 282]. Да апавядання не прад’яўляліся выразна строгія патрабаванні, што рабіла гэты жанр перыферыйным, адносна свабодным для мастакоўскага самавыражэння і таму больш прывабным.

Такім чынам, творчасць Я. Коласа 30–40-х гадоў знаходзіцца ў цеснай сувязі з сацрэалістычным канонам, якому характэрныя публіцыстычнасць, ідэалагічная ангажаванасць, рытарычнасць, рознага роду кліше (нязменна шчаслівы канец у апавяданнях, антытэза «стары свет – новы свет» і выразна кантрастнае іх абмаляванне і інш.), што тлумачыцца неабходнасцю пісьменніка ісці на кампраміс з савецкімі ўладамі. Пісьменнік, нягледзячы на фармальную кан’юнктурнасць, сацрэалістычную дэфармацыю жыццёвага матэрыяла, здолеў выявіць у змесце апавяданняў спецыфічную коласаўскую мудрасць, выкарыстоўваючы падтэкставую плынь.

## Літаратура


1. *Бурдьё, П.* Поле литературы [Электронный ресурс] / П. Бурдьё. – Режим доступа: http://bourdieu.name/content/pole-literatury. – Дата доступа: 29.08.2022.
2. *Гюнтер, Х.* Жизненные фазы соцреалистического канона // Соцреалистический канон. – СПб. : Акад. проект, 2000. – С. 281–288.
3. *Есаулов, И. А.* Литература как учебник жизни / И. А. Есаулов // Соцреалистический канон. – СПб. : Акад. проект, 2000. – С. 596–598.
4. *Колас, Я.* Збор твораў : у 20 т. / Я. Колас. – Мінск : Беларус. навука, 2007–2012. – Т. 6. Апавяданні (1925–1951), раннія празаічныя творы (1900–1906), пераклады (1907). – 2009. – 574 с.
5. *Мушынскі, М.* Мае Каласавіны: з вопыту вывучэння літаратурнай і грамадска-культурнай дзейнасці Якуба Коласа / М. Мушынскі. – 2-е выд., выпр. і дап. – Мінск : Беларус. навука, 2016. – 419 с.
6. *Соловей, Г. Р.* К вопросу теоретического осмысления концепции читателя в соцреализме / Г. Р. Соловей // Науч. записки НаУКМА: Филолог. науки. – 2003. – Т. 21. – С. 30–35.
7. *Тычына, М.* Проза / М. Тычына // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999. – Т. 2 – С. 62–133.